## Што такое адзінства?

Шуневіч Ганна, вучаніца VII класа,
дзяржаўная ўстановы адукацыі
“Сярэдняя школа № 3 г. Слоніма”

Кожны чалавек – гэта ўнікальная асоба са сваімі прынцыпамі і поглядамі на жыццё, але ёсць тое, што робіць яго патрэбным і важным у грамадстве, – гэта адзінства. У свеце розных культур, канфесій і народаў нельга існаваць без пачуцця яднання ў думках і справах з людзьмі, што цябе акружаюць. Што такое адзінства? Для мяне гэта не рытарычнае пытанне, а шматграннае паняцце. Каб вызначыць яго сутнасць, патрэбна разгледзець з самых розных бакоў.

Перш за ўсё лічу, што адзінства – гэта сям’я. Родныя людзі звязаны з табой адной крывёй, адной хатай, аднымі радасцямі і клопатамі. Менавіта ў сям’і мы вучымся спачуванню, любові, падтрымцы і цярпенню. Усе разам. Набываем першы вопыт адзінства.

Маюць рацыю і тыя, хто лічыць, што адзінства праяўляецца ў сяброўстве. Гэта таксама цікавы пункт гледжання. Сябры заўсёды дапамогуць адзін аднаму пераадолець перашкоды, раздзеляць як радасць перамог, так і горыч няўдач. Яны побач проста так. Проста таму, што яны сябры. Сяброўства – пачуццё, якое праносім праз усё жыццё, якое робіць нас згуртаванымі і шчаслівымі.

Больш важнае значэнне набывае адзінства, калі гаворка заходзіць пра цэлую краіну. На класнай гадзіне настаўніца расказвала, што з вызваленчага паходу Чырвонай Арміі ў верасні 1939 года ў ходзе Другой сусветнай вайны пачалося адраджэнне страчанай унутранай цэласнасці Беларусі. Менавіта дзень 17 верасня 1939 года аб’яднаў беларускі народ, даў магчымасць развівацца разам. Гэтая падзея нагадвае і падкрэслівае неаспрэчную ісціну: нам разлады не патрэбны. Таму адзінства – гэта наша нацыянальная каштоўнасць, якую беларусы абавязаны абараняць і захоўваць.

Ідэя народнага адзінства пранізвае ўсю гісторыю нашай краіны. На Беларусі спакон вякоў знаходзілі прытулак людзі, якія ратаваліся ад рэлігійных войнаў, міжусобіц, ганенняў. А ў дні ліхалецця яны аб’ядноўваліся з мясцовым насельніцтвам, каб змагацца з ворагам, пераадольваць нягоды і разам будаваць сваё шчасце.

Калі народ дзяржавы адзіны, ён усемагутны! Яскравым доказам гэтага з’яўляюцца падзеі Вялікай Айчыннай вайны. Перад тварам самай страшнай небяспекі нашы продкі аб’ядналіся, каб даць адпор нямецкім захопнікам. Дзеля сям’і, сяброў, роднай зямлі яны рызыкавалі сваім жыццём. Абарона Радзімы стала для іх не толькі грамадзянскім, але і асабістым маральным абавязкам. Гэта доказ сапраўднага народнага адзінства!

Я ганаруся тым, што сярод вызваліцеляў Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў былі і мае родныя. Мая прабабуля Замарухава Ніна Фёдараўна зусім юнай дзяўчынай у час вайны працавала на савецкім

аэрадроме. Яна займалася тэхнічным абслугоўваннем самалётаў, каб тыя баранілі наша неба.

Мой прадзед Замарухаў Пётр Ціханавіч зімой 1941 года быў адным з вадзіцеляў “Дарогі жыцця”. Такую назву атрымала лядовая дарога праз Ладажскае возера да блакаднага Ленінграда. Гэта быў адзіны шлях для перавозу ежы змучаным жыхарам горада. Штодзень мой прадзядуля садзіўся за руль грузавіка і праз бамбёжкі па лёдзе вёз ленінградцам не толькі ежу і медыкаменты, а і надзею на будучае, на перамогу. Ён рызыкаваў сваім жыццём, гаварыў, што трэба для перамогі зрабіць усё, што ў яго сілах.

Дзядуля майго таты, мой прадзед Савасценя Іван Рыгоравіч, з першых дзён вайны дабравольцам пайшоў на фронт. Інакш зрабіць ён не мог. Іван Рыгоравіч загінуў у 1944 годзе пры вызваленні Беларусі.

Вось што такое народнае адзінства! Беларусы спаўна засвоілі ўрокі мінулага, трагічныя старонкі сваёй гісторыі.

Цяпер адзінства народа таксама мае важнае значэнне. Кожны год успыхваюць новыя крызісы і войны. А ўсё таму, што народы разрозненыя. Напэўна, будуць новыя выпрабаванні, цяжкасці, каб пераадолець іх, краінам трэба будзе аб’яднацца! Выкараніць стэрэатыпы, вырашыць непаразуменні і працаваць на карысць людзей усёй планеты.

Можна пачаць з малога. Дапамагчы бацькам з хатімі справамі, растлумачыць сябру незразумелую тэму па вучэбным прадмеце. Не ленавацца і прыходзіць на суботнікі, займацца валанцёрствам у вольны ад ўрокаў час, ці нават проста пабудаваць шпакоўню для птушак. Галоўнае – пачаць карысную справу і добрасумленна выконваць свае абавязкі. Аднойчы ўласнае невялікае дасягненне стане грамадскім і вялікім. Калі ўсе будуць працаваць над агульнай справай і дапамагаць адзін аднаму, то рана ці позна перашкоды знікнуць, якімі б сур’ёзнымі яны ні былі.

Можна далучыцца да агульных спраў. Напрыклад, мой любімы горад Слонім прыгажэе з кожным годам. З’яўляюцца новыя мікрараёны, будуюцца жылыя дамы, дзіцячыя садкі, адкрыты сучасны фізкультурна-аздараўленчы комплекс, добраўпарадкаваны вуліцы горада. Танцавальныя калектывы Слонімшчыны вядомы далёка за межамі Беларусі. Сапраўдныя ўрокі духоўнасці, суперажывання, разумення таго, што аб’ядноўвае людзей, атрымліваюць гледачы ў пастаноўках народнага драматычнага тэатра. А Слонімская футбольная каманда “Талент” з’яўляецца чэмпіёнам Рэспублікі Беларусь сярод юніёраў. Пералічаныя дасягненні не толькі асабістыя, гэта малыя і вялікія дасягненні каманды аднадумцаў. Кожны на сваім месцы ўносіць уклад у пастаўленыя задачы. Поспех кожнага з нас у адзінстве ўсіх: толькі ўсе разам мы пераможам!

Упэўнена, што вышэйшая ступень праяўлення адзінства – гэта займаецца паважнай справай на карысць іншых. Тады мы будзем адкрытымі для новых ідэй і гатовымі да супрацоўніцтва, зможам стварыць гарманічнае і шчаслівае грамадства.